# ІНШЫ ПАЛІТАЛЯГІЧНЫ ЧАСОПІС

© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
(ISSN 1819-3625) №3 (2004) стр.121-122

Паліталягічны часопіс «PERPETUUM STUDIENS» быў заснаваны ў 2001 г. зь ініцыятывы ўдзельнікаў «Асацыяцыі маладых палітолягаў» (Львоў, Украіна). Гэтая няўрадавая арганізацыя аб'ядноўвае студэнтаў і навукоўцаў аддзяленьня паліталёгіі Львоўскага нацыянальнага ўнівэрсытэту імя Івана Франка і шэрагу іншых украінскіх навучальных установаў.

Для Ўкраіны, дзе спэцыялізацыя «паліталёгія» ёсьць амаль у кожным унівэрсытэце, з'яўленьне часопісу маладых палітолягаў ёсьць цалкам натуральнай зьявай нават ужо зыходзячы з самой велічыні «папуляцыі палітолягаў». Таксама цалкам натуральным быў і некаторы першапачатковы снабізм выданьня — ва Ўкраіне палітолягаў рыхтуюць і на факультэце філязофіі, і на факультэце права, і на факультэтах гісторыі альбо сацыялёгіі. З гэтага вынікала занёмае і беларускім палітолягам (альбо «палітолягам з дыплёмам», ці «сапраўдным палітолягам») імкненьне адмежавацца ад тых, хто з уласнага капрызу дадае да сваіх ініцыялаў пад газэтным артыкулам ганарлівае слова «палітоляг». Менавіта з гэтых штуршкоў і пачаўся працэс, які выліўся ў прэзэнтацыю 16 кастрычніка 2001 г. у Люстэркавай залі Львоўскага нацыянальнага ўнівэрсытэту новага паліталягічнага выданьня — часопісу «Perpetuum Studiens».

Асноўнай мэтай часопісу зьяўляецца разьвіцьцё ўкраінскай палітычнай навукі ды фармаваньне ўласнай украінскай школы палітычных дасьледаваньняў, стварэньне новага — сучаснага — паліталягічнага асяродзьдзя. Гэтае новае асяродзьдзе патрэбнае навукоўцам дзеля адэкватнага ўспрыняцьця і канцэптуалізацыі ўкраінскага палітычнага кантэксту ў катэгорыях сучаснай палітычнай навукі, яе законамі і метадамі дасьледаваньня. Нягледзячы на бурнае разьвіцьцё ўкраінскай паліталёгіі, у гэтай краіне яшчэ ня склалася выразная сыстэма гэтай дысцыпліны — мяркуюць выдаўцы часопісу. Таму палітолягі Ўкраіны збольшага карыстаюцца напрацоўкамі замежных аўтараў, далучаюцца да іншаземных дасьледчых традыцыяў, што не задавальняе маладых навукоўцаў. З гэтай незадаволенасьці і паўстала ідэя часопісу, які б дапамог асяродку маладых навукоўцаў спрычыніцца да стварэньня ўласна ўкраінскага «паліталягічнага прадукту». Інакш кажучы, моладзь адпачатку заняла дастаткова крытычную пазыцыю адносна той паліталягічнай плыні, якая склалася ў асяродку асноўнага ўкраінскага паліталягічнага выданьня «Палітычная думка» і шэрагу спекулятыўных паліталягічных перыёдыкаў, што час ад часу спараджаюцца ў асяродзьдзі ўкраінскага трэцяга сэктару (падчас кожнай выбарчай кампаніі тутэйшы палітыкум выносіць на паверхню ня менш за паўтузіна «палітычна-аналітычных і публіцыстычных» выданьняў, зьвязаных з тым ці іншым навуковым альбо палітычным праектам). Ці здолела моладзь стварыць сапраўды прадукт іншай якасьці — беларускаму назіральніку сказаць цяжка.

Заяўлены фармат выданьня — «маладзёвая візія паліталягічнага дыскурсу». Грунтуючыся на пераканаsuccessfully

 ньні, што студэнты паліталёгіі павінныя «ня толькі вучыцца, але і думаць», «Perpetuum Studiens» дае амбітным маладым палітолягам магчымасьць далучыцца да актуальных баталіяў у палітычнай навуцы. Такім чынам навучэнцы здабываюць прафэсійнасьць пры адстойваньні сваіх навуковых напрацовак і… рухаюць наперад палітычную навуку. Для дасягненьня мэтаў выданьня на ягоных старонках зьмешваюцца бескампраміснасьць «бессаромных маладых» з досьведам і ведамі «адкрытых для інавацыяў старых».

У часопісе друкуюцца працы маладых навукоўцаў, пераважна саміх студэнтаў. Навокал часопісу ўжо ўтварылася пэўнае кола студэнтаў, маладых спэцыялістаў і выкладнікаў, зацікаўленых у разьвіцьці нацыянальнай школы палітычных дасьледаваньняў. Дзякуючы гэтаму за тры гады «Perpetuum Studiens» пераўтварыўся з выданьня студэнтаў і для студэнтаў у пляцоўку для паліталягічных дыскусіяў, якія часам выходзяць з часопісных старонак на публічны ўзровень у выглядзе канфэрэнцыяў, сэмінараў, круглых сталоў і публічных дэбатаў. Дзякуючы наяўнасьці супольнай дыскусіўнай прасторы, вакол часопісу гуртуюцца таксама і спэцыялісты ў галіне культуралёгіі і філязофіі, што зацікаўленыя ў дасьледаваньні палітычных фэномэнаў.

Асноўнымі сфэрамі дасьледаваньня часопісу «Perpetuum Studiens» зьяўляюцца тэарэтыка-мэтадалягічныя асновы паліталёгіі, філязофія палітыкі, геапалітычныя і гендэрныя штудыі, вывучэньне месца Украіны ў сусьветных глябалізацыйных працэсах. На старонках часопісу вялікая ўвага надаецца пытаньням тэорыі і практыкі айчынных палітычных працэсаў, праблемам палітычнай канфлікталёгіі і рэгіянальнай інтэграцыі з пункту гледжаньня украінскіх дасьледнікаў.

Рэдакцыйная Рада часопісу складаецца ў асноўным з саміх студэнтаў аддзяленьня палітычнай навукі, якое ва Ўнівэрсытэце імя Івана Франка месьціцца на філязофскім факультэце. Магчыма, таму для характарыстыкі сябраў рэдакцыйнай Рады і аўтараў выкарыстоўваюцца шматзначныя фармулёўкі «арыенталіст, студэнт аддзяленьня філязофіі», «іміджмэйкер, студэнтка аддзяленьня паліталёгіі», «утылітарыст», «постмадэрніст» альбо нават «правакатар».

Выдаўцы часопісу імкнуцца да стварэньня тэматычных нумароў. Напрыклад, ужо пабачыў сьвет нумар, прысьвечаны тэме «Гендэр і палітыка». У ім знайшлося месца для тэарэтычных напрацовак па гэтай праблематыцы, а таксама для дасьледаваньняў практычнага характару. У прыватнасьці, аўтары зьмешчаных тут артыкулаў разглядаюць праблемы палітычнага, сацыяльнага і псіхалягічнага кшталту, якія перашкаджаюць актыўнаму далучэньню ўкраінскіх жанчын да працэсу прыняцьця палітычных рашэньняў.

У дадзены момант рэдакцыя часопісу шчыльна супрацоўнічае зь вядомым львоўскім культуралягічным часопісам «Ї» (Ji). Напэўна, аўтарытэтныя львоўскія інтэлетуалы зь «Ї», такія як Тарас Вазьняк, імкнуцца такім чынам захаваць і перадаць у спадчыну школу мысьленьня, якая яшчэ далёка ня вычарпала магчымасьці да разьвіцьця. У 2004 г. быў выдадзены сумесны нумар «Мораль-Політика-Маніпуляція»: гэтай тэматыцы быў прысьвечаны і нумар «вялікага» «Ї», і ўласна паліталягічны нумар «Perpetuum Studiens». На старонках гэтага нумару рэдакцыя разгарнула дыскусію адносна тэарэтычных аспэктаў рэалізацыі палітыкі на аснове маралі, а таксама адносна пытаньняў ўзаемапранікненьня палітыкі і маралі ў сучасным пастмадэрным палітычным полі. Пытаньні палітычных маніпуляцыяў у асноўным разглядаюцца аўтарамі з пункту гледжаньня паблік рылэйшнз, выкарыстаньня і штучнага стварэньня палітычных мітаў. Са зьместам гэтага нумару можна азнаёміцца па адрасе http://www.ji-magazine.lviv.ua/ji-junior/N30-1/N30-1manipul.htm.

Наступны нумар часопісу выдаўцы мяркуюць прысьвяціць магчымым пэрспэктывам украінскай дзяржавы ў кантэксьце сусьветных інтэграцыйных і глябалізацыйных працэсаў. Надалей часопіс будзе па чарзе зьвяртацца і да тэарэтычных, і да прыкладных праблемаў.

*Падрыхтаваў Юрый Чавусаў*